Пролетарыі ўсіх краін, єднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 286 (355)
ПЯТНІЦА
13
СНЕЖНЯ
1940 г.

Цана 10 капеек.

15 снежня 1940 г.—выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

Грамадзяне і грамадзянкі! Усе як адзін з'явімся да выбарчых урнаў і аднадушна будзем галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных!

Паслязаўтра—выбары

Паслязаўтра — выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Сёння і заўтра на ўсіх выбарчых участках завяршаюцца апошнія падрыхтаванні.

Агіткалектывы, выбарчыя камісіі, увесь актыў нашай вобласці пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый правёў за прайшоўшыя два месяцы выключна вялікую работу. Сотні тысяч выбаршчыкаў яшчэ раз дэтальна азнаёмлены са Сталінскай Канстытуцыяй і Палажэннем аб выбарах. У гуртках і індывідуальных гутарках агітатары расказалі насельніцтву аб тых велізарных дасягненнях, якіх дабіўся пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі вызвалены народ заходніх абласцей БССР. Шырока растлумачаны сярод выбаршчыкаў біяграфіі кандыдатаў у дэпутаты.

15 снежня роўна ў 6 гадзін раніцы радушна адчыняцца дзверы выбарчых участкаў. Выбаршчыкі заходніх абласцей Беларусі і Украіны як адзін прыдуць да выбарчых урнаў і аднадушна прагаласуюць за сваіх народных прадстаўнікоў, за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Упершыню на аснове Сталінскай Канстытуцыі вызваленымі народамі будуць выбраны органы мясцовай улады — улады советскай, народнай.

Да дня выбараў ужо сёння гатовы большасць выбарчых участкаў.

Вось участак № 8 Фабрычнай выбарчай акругі (г. Беласток). Яшчэ некалькі дзён назад закончана яго афармленне. Лозунгі, плакаты, партрэты ўпрыгожваюць сцены пакоя адпачынку. Рэгулярна выходзіць насценная газета. Своечасова праведзены сустрэчы з кандыдатамі ў дэпутаты. На ўчастку пабывалі ўсе 1.495 выбаршчыкаў, яны праверылі правільнасць занясення іх у спіскі, праслухалі рад дакладаў, лекцый, канцэртаў.

Тое-ж самае можна сказаць і аб беластоцкім выбарчым участку імені Міцкевіча, дзе старшыняй участковай камісіі працуе супрацоўніца 6-га тэкстыльнага камбіната тав. Дзінабурская. На працягу ўсяго часу выбарчай кампаніі тут існаваў стол даведак. Добра абсталявана вітрына з біяграфіямі кандыдатаў у дэпутаты абласнога і гарадскога Советаў.

На гэтых і на многіх іншых участках Беластока ўжо закончана абсталяванне кабін, падрыхтаваны урны, бюлетэні, пакоі адпачынку для выбаршчыкаў, буфеты і т. д. На выбарчым участку № 4, Ленінскай акругі, даўно размеркаваны абавязкі членаў камісіі па правядзенню дня выбараў. На 10-м выбарчым участку, які размешчан пры фабрыцы № 23, да 11 снежня выпісаны паведамленні выбаршчыкам аб месцы і дню выбараў. Выбарчая камісія гэтага ўчастка на радзе дамоў развесіла спецыяльныя вывескі з паказаннем адраса ўчастка.

— Да выбараў мы поўнасцю гатовы, — заяўляе намеснік старшыні Фабрычнай участковай выбарчай камісіі № 10 тав. Кагановіч, — у 6 гадзін раніцы 15 снежня мы шырока і з радасцю адчыням выбарчыкам дзверы нашага ўчастка. Аб поўнай гатоўнасці ўчасткаў таксама паведамляюць з Гродна, Дамброва, Бельска, Саколак і іншых гарадоў і раёнаў нашай вобласці.

Але так абстаяць справы яшчэ пакуль што не на ўсіх участках.

У Беластоку, напрыклад, далёка не ўсё падрыхтавана на выбарчых участках №№ 50, 55. Выбарчы ўчастак № 50 (старшыня камісіі тав. Пульны) наведалі толькі 154 выбаршчыкі з 743 па спіску. У выніку — большасць прозвішчаў не праверана да апошніх дзён, маючая месца блытаніна не выпраўлена. Такая-ж карціна і на выбарчым участку № 55 (старшыня камісіі тав. Філюкін). Больш 10 дамоў аказаліся прапушчанымі па Ленінскай вуліцы па тэрыторыі выбарчага ўчастка № 1, Ленінскай акругі, прычым участак дрэнна афорлмен.

У нас ёсць усе магчымасці за апошнія два дні поўнасцю выправіць усе недахопы і па-большэвіцку завяршыць падрыхтоўку да выбараў.

Прымацаваным да выбарчых участкаў партыйным арганізацыям неабходна мабілізаваць усе свае сілы, усіх комуністаў, комсамольцаў, увесь беспартыйны актыў на тое, каб дзень выбараў сустрэць у поўнай гатоўнасці. Ні адной недаробленай ці недавыкананай справы! Кожнае намечанае мерапрыемства павінна быць поўнасцю выканана!

Перш за ўсё трэба закончыць растлумачэнне выбарчага закона, асабліва парадку і тэхнікі галасавання, ахапіць усіх выбаршчыкаў гутаркамі аб кандыдатах у дэпутаты, аб якіх павінен дасканала ведаць кожны выбаршчык.

Яшчэ і яшчэ раз трэба праверыць спіскі выбаршчыкаў. Членам камісій, у першую чаргу акруговых, трэба высветліць, ці не прыбылі новыя выбаршчыкі, ці не выехаў хто з тэрыторыі акругі. Неабходна на ўсіх участках арганізаваць правільнае запаўненне і раздачу да вечара 14 снежня ўсім выбаршчыкам паведамленняў аб дні і месцы галасавання.

Вялікае значэнне мае афармленне ўчастка. Выбаршчыкі чакаюць радушнай сустрэчы на ўчастку. Патаму ўчастковым камісіям, прымацаваным партыйным арганізацыям трэба па-большэвіцку завяршыць падрыхтоўку і ў гэтай галіне. Кожны выбарчы ўчастак павінен выглядаць, як самае культурнае месца ў горадзе, пасёлку, вёсцы. Трэба развесіць лозунгі, плакаты, партрэты, арганізаваць для выбаршчыкаў мастацкую самадзейнасць, адкрыць буфеты, пакоі для дзяцей і т. д.

Кожная ўчастковая выбарчая камісія ўжо сёння павінна атрымаць ад выканкомаў і сельсоветаў у дастатковай колькасці ўсе неабходныя выбарчыя дакументы: бюлетэні, пратаколы і т. д. Кожны член камісіі ўжо зараз павінен ведаць свае абавязкі ў дзень выбараў.

Па-большэвіцку завяршым апошнія падрыхтаванні! Па-большэвіцку арганізуем і правядзем першыя выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных!

Перадвыбарчы сход рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых Кішынёўскай дзяржаўнай электрастанцыі вылучыў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета Малдаўскай ССР

таварыша І. В. Сталіна

КІШЫНЁЎ, 11 снежня. (ТАСС). З велізарным уздымам прайшоў перадвыбарчы сход на Кішынёўскай электрастанцыі. Інжынеры, тэхнікі і служачыя сабраліся, каб вылучыць кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Малдаўскай ССР.

Слова атрымлівае стары машыніст Кірыл Сцефанавіч **Выстрэбаў.**

— Першым кандыдатам у Вярхоўны Совет Малдавіі, — гаворыць ён, — я вылучаю таго, хто вызваліў нас ад ігра румынскіх баяр, хто даў нам самую дэмакратычную ў свеце канстытуцыю, нашага роднага, любімага Сталіна.

Громам апладысментаў, воклічамі прывітання ў часць таварыша Сталіна сустракаюць удзельнікі схода гэтыя словы старога рабочага.

Глыбока прачуленую прамову сказаў слёсар Тыгран Іванавіч Лазаран:

— Сталін — гэта наша сонца. Яго імя натхняе ўсіх нас на самаадданую работу, на подвігі ў славу соцыялістычнай радзімы. У вызваленай ад рабства Бесарабіі пад праменнямі Сталінскай Канстытуцыі расцвітае шчаслівае, цудоўнае жыццё.

Прамоўца выразіў пачуцці і думкі ўсіх сабраўшыхся, усяго вызваленага бесарабскага народа:

— Няхай жыве вялікі Сталін!— раздаюцца воклічы, зноў успыхвае магутная авацыя. Сход з незвычайным натхненнем прымае пастанову:

«Рабочыя, інжынерна-тэхнічны персанал, служачыя Кішынёўскай дзяржаўнай электрастанцыі вылучаюць сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета Малдаўскай ССР таварыша Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, 1879 года нараджэння, генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў), пражываючага ў г. Маскве, і просяць таварыша Сталіна даць згоду балатыравацца па Ленінскай выбарчай акрузе № 264».

Перадвыбарчы сход рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых цукровага і спіртовага заводаў г. Бельцы вылучыў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета Малдаўскай ССР

таварыша В. М. Молатава

БЕЛЬЦЫ, 11 снежня. (ТАСС). На перадвыбарчы сход рабочых, інжынерна-тэхнічнага персанала і служачых цукровага і спіртовага завода г. Бельцы прышло звыш 400 чалавек. На павестцы дня — вылучэнне кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Малдаўскай ССР.

Слова прадастаўляецца загадчыцы аддзелам кадраў цукровага завода тав. Еве Раб.

— Я прапаную, — заявіла яна,— вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета Малдавіі бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна — главу Советскага Урада таварыша Вячаслава Міхайлавіча Молатава.

Прапанова тав. Раб выклікае магутную авацыю. На трыбуну падымаецца слёсар гэтага завода тав. Варгуляк.

— На працягу многіх год,— сказаў т. Варгуляк,—выдатны кіраўнік урада першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы Вячаслаў Міхайлавіч Молатаў няўхільна ажыццяўляе сталінскую палітыку міру і ўмацавання абараноздольнасці нашай радзімы, якая забяспечвае ўсім народам Советскага Саюза шчаслівае жыццё, якая забяспечвае працвітанне і магутнасць нашай радзімы.

З вялікім уздымам сход прымае пастанову:

«Калектывы работнікаў бельцкіх цукровага і спіртовага заводаў, сабраўшыся на перадвыбарчы сход, прысвечаны вылучэнню кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Малдавіі, вылучаюць сваім кандыдатам у Вярхоўны Совет Малдаўскай ССР таварыша Вячаслава Міхайлавіча Молатава, члена ВКП(б), працуючага ў Маскве старшынёй Соўнаркома СССР і Народным Камісарам Замежных Спраў. Сход просіць тав. Молатава даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Малдаўскай ССР па Бельцкай выбарчай акрузе № 124».

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ПА АСІПАВІЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

ТАВ. І. С. БЫЛІНСКІ ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Згодна Ўказа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, 22 снежня адбудуцца выбары дэпутата ў Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР па Асіпавіцкай выбарчай акрузе № 64.

Нядаўна адбыўся шматлюдны перадвыбарчы сход рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў Асіпавіцкага чыгуначнага вузла. Майстар паравознага дэпо тав. Курчэўскі прапанаваў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей па Асіпавіцкай выбарчай акрузе № 64 старшыню Совета Народных Камісараў БССР тав. Былінскага Івана Сямёнавіча.

— Тав. Былінскі,—сказаў ён,— сын чыгуначніка і сам працаваў слёсарам на чыгунцы. На працягу ўсёй сваёй работы ён даказаў сваю адданасць справе партыі Леніна — Сталіна. Прапанову тав. Курчэўскага падтрымалі слёсар-стаханавец тав. Юшкевіч і работнік станцыі тав. Маёраў. Сход аднадушна вылучыў кандыдатуру тав. І. С. Былінскага.

Прапанову чыгуначнікаў падтрымалі рабочыя шклозавода «Кастрычнік», торфзавода «Свабода», калгаснікі калгаса «Усход», Свіслацкага сельсовета, Асіпавіцкага раёна, а таксама працоўныя Чэрвеньскага, Рудзенскага і Пухавіцкага раёнаў, якія ўваходзяць у выбарчую акругу № 64.

5 снежня ў асіпавіцкім Доме соцкультуры адбылася акруговая перадвыбарная нарада прадстаўнікоў працоўных. Нарада прайшла вельмі актыўна. Ад імені рабочых Асіпавіцкага чыгуначнага вузла выступіў тав. Маёраў. Ён сказаў:

— На перадвыбарным сходзе наш калектыў вылучыў кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР аднаго з лепшых сыноў большэвіцкай партыі старшыню СНК БССР тав. Былінскага. Тав. Былінскі вырас ад радавога рабочага-слёсара да дзяржаўнага дзеяча. Такі рост магчым толькі ў краіне соцыялізма. Мы ўпэўнены, што тав. Былінскі апраўдае наша давер'е, будзе такім дэпутатам, якім вучыць быць таварыш Сталін.

Выступіўшыя тт. Капавалаў (соўгас «Ілюстрыя», Пухавіцкага раёна), Пэўны (торфзавод «Дукора», Рудзенскага раёна), Карпенка (настаўнік Асіпавіцкага раёна) і іншыя падтрымалі заяву тав. Маёрава. Яны прасілі нараду вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР ад Асіпавіцкай выбарчай акругі тав. Былінскага.

На нарадзе з прамовай выступіў старшыня СНК БССР тав. І. С. Былінскі. Ён падзякаваў працоўных за давер'е і расказаў сваю біяграфію.

Нарада аднадушна пастанавіла вылучыць тав. І. С. Былінскага кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей, зацвердзіла спісак даверных асоб па выбарчых участках і прыняла зварот да ўсіх выбаршчыкаў акругі.

8 снежня тав. Былінскі сустрэўся з выбаршчыкамі Чэрвеня і Смілавіч.



Сустрэнем дзень выбараў новымі вытворчымі перамогамі

Расце прадукцыйнасць працы

ГРОДНА. (**По тэлефону**). Гродненскі фанерны завод адзін час лічыўся адным з адстаючых прадпрыемстваў, з месяца ў месяц не выконваў вытворчай праграмы. Цяпер, рыхтуючыся да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, калектыў завода значна палепшыў сваю работу, пачаў штодзённа перавыконваць план.

Вось пекаторыя лічбы. 7 снежня завод выканаў праграму на 121,8 процанта, 9 снежня — на 123 процанты, а 10 — на 126,8 процанта. Рост у выкананні плана тлумачыцца велізарным вытворчым уздымам, які заваў назірацца сярод калектыва рабочых.

Выдатных паказчыкаў дабіліся многія брыгады завода. Так, напрыклад, брыгада тав. Амельянчыка на ўкладцы пакетаў 6 снежня выканала праграму на 160,5 процанта. Днём пазней брыгада тав. Улейчука, якая працуе на клеевых вальцах, дасягнула высокай выпрацоўкі. За гэты дзень брыгада тав. Улейчука выканала план на 188 процантаў.

На фанерным заводзе сваёй узорнай стаханаўскай працай выдзяляецца і рад іншых брыгад. Узяць, напрыклад, брыгаду тав. Курніцкага: яна 10 снежня выканала план на 166 процантаў. Выдатных паказчыкаў дабілася таксама і іншыя брыгады.

Добра працуе вытворчы ўчастак, дзе майстрам кандыдат у дэпутаты абласнога Совета т. Марыя Астроўская. Яе ўчастак сістэматычна перавыконвае вытворчае заданне.

У лесарубаў

Сярод лесарубаў Беластоцкага леспрамгаса шырыцца соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Перадавыя лесарубы дабіліся высокіх паказчыкаў у сваёй рабоце. Асабліва выдзяляюцца стаханаўцы Катрынскага лесаўчастка. Лесарубы тт. Кубяк, Філіпяк, Шурма сістэматычна даюць звыш паўтары нормы. Добра працуюць лесарубы тт. Шуба, Караткевіч і іншыя.

Высокапрадукцыйна працуюць лесарубы-лучкісты Супраслеўскага лесаўчастка тт. Антановіч і Сочка, якія выконваюць заданне на 160 процантаў.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА БРЫГАДЫ МАШЫНІСТА КАВАЛЁВА

ВАЛКАВЫСК. Брыгада машыніста Валкавыскага дэпо тав. Кавалёва рыхтуе дастойную сустрэчу дню выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Машыніст тав. Кавалёў з сваім напарнікам тав. Гузікавым паставілі свой лакаматыў на прамыўку пасля 7.500 кіламетраў міжпрамывачнага прабегу пры норме 2.000 кіламетраў.

Брыгада ўзяла на сябе абавязацельства ў часць выбараў давесці міжпрамывачны прабег паравоза да 8.000 кіламетраў. За лістапад тт. Кавалёў і Гузікаў зэканомілі 16 тон вугалю.

550 процантаў нормы

Асобныя брыгады грузчыкаў станцыі Беласток-Цэнтральны паказваюць высокія ўзоры работы на пагрузцы і выгрузцы.

Брыгада ў саставе тт. Касцянчыкава, Лавіцкага і Амбражэя выканала дзённую норму на 550 процантаў. Свой рэкорд брыгада прысвяціла выбарам у мясцовыя Советы.

ЦЭМЕНТНЫ ЗАВОД ВЫКАНАЎ ГАДАВЫ ПЛАН

РОСЬ. (**По тэлефону**). Да дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных калектыў цэментнага завода «Рось», Валкавыскага раёна, падыходзіць са значнымі вытворчымі дасягненнямі. 6-га снежня выканан гадавы план па абжыгу клінкера. 1-га снежня калектыў закончыў гадавую праграму па выпуску валавой прадукцыі на 101,7 процанта. Узята абавязацельства да 18-га снежня выканаць гадавы план па памолу цэменту.

Машыніст экскаватарнай машыны стаханавец тав. Палучык выконвае план на 125,6 процанта. Рабочы кар'ера кандыдат у дэпутаты абласнога Совета Іван Чэрвонік дае 144 проценты нормы.

Поспехі калектыва Гродненскага шклозавода

Шырока разгортваючы соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу выбараў у мясцовыя Советы, калектыў Гродненскага шклозавода дабіўся новых вытворчых перамог.

Па гадавому плану завод павінен быў выпусціць 7 мільёнаў 399 тысяч бутэлек. На 11 снежня выпушчана 7 мільёнаў 424 тысячы.

Лепшыя стаханаўцы шклозавода дабіліся высокіх паказчыкаў. Напрыклад, Франц Балдыга выконвае план на 123 проценты, Коніцэк Феліке і Мажэйка—на 132 процанты.

Г. Балын.

Помнік В. П. Чкалаву

Да другой гадавіны з дня смерці В. П. Чкалава ў горадзе Горкім будзе ўстаноўлен помнік вялікаму лётчыку. У майстэрнях культурнага камбіната «Всекохудожник» закончана адліўка 5-метровай бронзавай постаці лётчыка, зробленай па праекту скульптара І. А. Мендзялевіча. Чкалаў ізабражон ва ўвесь рост з абнажонай галавой. Яго позірк накіраван увысь. Лётчык накінуў на плечы меховую рукавіцу. На ім зімовы лётны касцюм.

Адкрыццё помніка В. П. Чкалаву ў Горкім адбудзецца 15 снежня. На ўрачыстае адкрыццё прыедуць члены сям'і Чкалава, маскоўскія мастакі, скульптары і архітэктары, бліжэйшыя сябры вялікага лётчыка.

Хто жадае далейшага ўмацавання дружбы народаў СССР, поўнай палітычнай роўнасці народаў, той будзе галасаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.



На здымку: кандыдаты плюшавай фабрыкі ў Беластоцкі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных. Злева направа: Рудзінскі Ф. С., Петручук Я. Ф., Гальперын Н. І., Альшэўскі В. А., Кандрацкая Е. В., Пятроўскі В. М., Максімовіч А. І.

Фота А. Сапіра.

КАНДЫДАТЫ ПЛЮШАВАЙ ФАБРЫКІ Ў БЕЛАСТОЦКІ ГАРАДСКІ СОВЕТ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

У самыя добрыя для капіталістаў годы на беластоцкай плюшавай фабрыцы працавала да 200 чалавек. Зараз калектыў фабрыкі налічвае 490 рабочых і служачых.

На фабрыцы растуць стаханаўцы, камандзіры вытворчасці. Лепшых з іх калектыў прадпрыемства вылучыў кандыдатамі ў Беластоцкі гарадскі Совет.

Екацерына Войцэхаўна Кандрацкая

Яна самая маладая з кандыдатаў—ёй 24 годы. Бацька селянін, які меў 1 гектар зямлі, а сям'я складалася з 5 чалавек. З самых маладых гадоў Екацерына працуе ў кулакоў. Памірае бацька. На плечы маладой дзяўчыны кладуцца абавязкі главы сям'і.

У 1936 годзе яна паступае на плюшавую фарыку ў якасці ткачыхі. Праз пяць месяцаў фабрыкант выкідвае яе за вароты. Доўгія месяцы беспрацоўя. У канцы 1937 года яе зноў прынялі на плюшавую фабрыку — і зноў звольнілі праз некалькі месяцаў.

У верасні 1939 года Беласток стаў совецкім горадам, і Екацерына цвёрда ўпэўнена, што больш беспрацоўнай яна ўжо не будзе.

У сакавіку Кандрацкая пераходзіць працаваць на ворсавы станок. Працуе добра, па-стаханаўску і прымае дзейны ўдзел у грамадскай рабоце—з'яўляецца старшынёй фабрычнай арганізацыі Чырвонага Крыжа.

Аляксандра Іванаўна Максімовіч

Тав. Максімовіч таксама ткачыха. Яна на 8 год старэй Кандрацкай.

Дачка рабочага - чыгуначніка, Аляксандра Іванаўна яшчэ ў 1925 годзе пачала працаваць у прыватным магазіне ў якасці прадаўшчыцы за 15 злотых у месяц. Калі яна страціла гэту «пасаду», прыйшлося брацца за ўсякую работу, якая толькі траплялася пад рукі.

У 1937 годзе Максімовіч паступіла на плюшавую фабрыку. Пры фабрыканце яна прабыла на прадпрыемстве 2 годы, але працавала за гэты час толькі 7 месяцаў.

З студзеня 1940 года Аляксандра Іванаўна працуе ўжо на совецкай плюшавай фабрыцы, дае 125 процантаў нормы і зарабляе 400 рублёў у месяц.

— Абяцаю ўсімі сіламі як найлепш працаваць на дабро народа, каб аддзякаваць совецкай уладзе, комуністычнай партыі і вялікаму Сталіну за ўсё тое, што для мяне зроблена,—гаворыць тав. Максімовіч.

Яніна Фомаўна Петручук

Яніне Петручук 26 год. Паходзіць яна з сялянскай сям'і. Восем год таму назад яна пакінула бацькоўскі дом у вёсцы і прыбыла ў Беласток на заробкі.

Па вуліцах хадзілі тады сотні беспрацоўных, кваліфікаваных ткачоў, слёсараў, для якіх пры капіталістычных умовах не было работы. Якія-ж перспектывы былі для сялянскай дзяўчыны, толькі-што прыбыўшай з вёскі? Прышлося паступіць на работу прыслугай.

У 1937 годзе яна пачынае працаваць на плюшавай фабрыцы. Пасля 5 месяцаў фабрыка часткова спыніла сваю работу, і зноў прышлося шукаць работы прыслугі. Калі фабрыка стала совецкай, да тав. Петручук прышлі дамоў клікаць яе на работу.

Зараз Петручук лічыцца адной з лепшых ткачых фабрыкі, працуе на двух станках, перадае свой вопыт іншым работніцам. Яна ўжо навучыла ткацтву 3-х вучаніц. Яніна Фомаўна ўзначальвае арганізаваную на фабрыцы брыгаду імені МОПР, якая складаецца з 8 ткачых.

Вацлаў Міхайлавіч Пятроўскі

Месяц таму назад, у дні кастрычніцкіх свят, апрэтурна-фарбавальнаму цэху беластоцкай плюшавай фабрыкі за добрую работу быў уручан пераходны чырвоны сцяг. Гэты цэх узначальвае стары кадравы рабочы фабрыкі Вацлаў Міхайлавіч Пятроўскі.

Годы беспрацоўя, у рэдкіх прамежках выпадковая работа на будаўніцтве ў якасці цясляра ці падсобнага рабочага, — так прайшлі маладыя годы Пятроўскага ў капіталістычным Беластоку.

У 1935 годзе ён паступае на плюшавую фабрыку ў аддзелачны цэх.

1937 год. На фабрыцы праходзіць шасцімесячная забастоўка рабочых. Адным з кіраўнікоў забастоўкі быў Вацлаў Міхайлавіч.

Рабочыя тады забастоўку выйгралі, але фабрыкант пасля таго, як рабочыя вярнуліся на работу, паступова выкінуў усіх удзельнікаў забастоўкі.

У верасні 1939 года ў Беласток прышла Чырвоная Армія. Пачалося адпаўленне фабрыкі. Усю сваю энергію, усе здольнасці аддаў Пятроўскі гэтай справе. Па яго ініцыятыве паспяхова развіваецца на фабрыцы соцыялістычнае спаборніцтва. Вацлаў Міхайлавіч знаходзіць таксама час для актыўнай грамадскай дзейнасці — ён з'яўляецца старшынёй фабкома.

Франц Сямёнавіч Рудзінскі

Сялянскі сын Франц Сямёнавіч Рудзінскі працуе на плюшавай фабрыцы з 1928 года ў якасці слесара. Але тады на прадпрыемстве работы было толькі на працягу некалькіх месяцаў у год. Астатні час Рудзінскі быў беспрацоўным.

Франц Сямёнавіч прымаў удзел у забастоўцы 1937 года, затым разам з іншымі ўдзельнікамі гэтай забастоўкі быў выкінут з прадпрыемства. Некалькі месяцаў ён працуе на адной з лодзінскіх фабрык.

Нямала было работы ў Франца Сямёнавіча ў канцы 1939 года, калі совецкая ўлада пусціла ў ход фабрыку. Пры фабрыканце-ж большасць станкоў стаяла, а совецкая ўлада патрабавала пусціць усе станкі.

Рудзінскі зараз з'яўляецца майстрам механічнага цэха. Ён добры спецыяліст, чэсны рабочы, аддаты справе свайго класа.

Владзімір Аляксандравіч Альшэўскі

Хвалюючыя дні перажываў Беласток у другой палове верасня 1939 года. У горадзе чакалі прыбыцця Чырвонай Арміі. На Ўсходнім шасе з сцягамі, лозунгамі, кветкамі сабраліся працоўныя, каб сустрэць доўгачаканых гасцей. Сярод чакаючых быў таксама Владзімір Аляксандравіч Альшэўскі.

Яшчэ ў 1923 годзе Альшэўскі пачаў працаваць на былой фабрыцы Новіка (цяпер 5-ты камбінат). Праз тры месяцы яго звольнілі.

У верасні 1927 года ён паступае ткачом на плюшавую фабрыку. Владзімір Аляксандравіч прымаў удзел ва ўсіх забастоўках, якія былі на прадпрыемстве. За ўдзел у апошняй забастоўцы 1937 года фабрыкант аддаў яго пад суд.

Зараз Владзімір Аляксандравіч адзін з камандзіраў вытворчасці беластоцкай плюшавай фабрыкі, майстар падрыхтоўчага аддзела. Ён прымае таксама дзейны ўдзел у грамадскай рабоце, з'яўляецца сакратаром фабкома.

Нісан Ідэлевіч Гальперын

Дырэктар беластоцкай плюшавай фабрыкі Нісан Ідэлевіч Гальперын адносна малады чалавек. Яму ўсяго 37 год. Але яго працоўны стаж—26 год. 11-гадовым хлопчыкам пачаў Нісан сваю працоўную дзейнасць як чорнарабочы. З 1928 года—ён член комуністычнай партыі.

25 кастрычніка 1939 года ён быў назначан камісарам на беластоцкую плюшавую фабрыку, правёў яе нацыяналізацыю і пусціў у ход прадпрыемства.

У сваёй рабоце ў якасці дырэктара плюшавай фабрыкі Нісан Ідэлевіч дабіўся вялікіх поспехаў. Пры фабрыканце прадпрыемства давала ў год максімум да 200 тысяч метраў тавара. У 1940 годзе яно дасць звыш 300 тысяч метраў. Да 15 снежня, дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, будзе поўнасцю выканана гадавая праграма. У 1941 годзе фабрыка выпусціць 450 тысяч метраў высокаякаснага тавару.

Тав. Гальперын з'яўляецца членам Беластоцкага гаркома партыі. Сярод рабочых ён карыстаецца вялікім аўтарытэтам.

Б. Масенжнік.

Сустрэчы выбаршчыкаў з сваімі кандыдатамі

Клуб беластоцкага шклянога завода запоўніўся выбаршчыкамі. І старыя, убеленыя сівізной, і маладыя прышлі сюды на сустрэчу з кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета тав. Станіславам Ігнацьевічам Лапотам.

Даверапы тав. Цёмкін, які адкрыў сход, гаворыць аб вялікім значэнні выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, аб кандыдаце ў дэпутаты горсовета тав. Лапоі.

Цёпла сустракаюць прысутныя выступленне тав. Лапота. Ён расказвае пра свой жыццёвы шлях, абліхалях, якія яму прышлося перанесці ў былой панскай Польшчы. Тав. Лапоту ўсяго 26 год. Але ён на сваёй уласнай спіне адчуў увесь гнёт капіталістычнай эксплаатацыі. Яшчэ 14-гадовым юнаком Станіслаў пайшоў працаваць на шкляны завод, на той самы завод, дзе працаваў яго бацька—стары патомствены шклодуў.

Рана ў Станіслава прабудзілася класавая свядомасць. Ён быў непрымірым да эксплаататараў, і за гэта яго неаднаразова звальнялі з работы.

У 1932 годзе Станіслаў Лапот уступіў у падпольную арганізацыю комсамола. Ён увесь аддаецца грамадскай дзейнасці, за што яго неаднаразова арыштоўваюць. Аднойчы тав. Лапот, не гледзячы на забарону адміністрацыі, у дзень першага Мая арганізаваў дэманстрацыю рабочых. За гэта яго звольнілі з завода.

З прыходам Чырвонай Арміі тав. Лапот адразу-ж уключаецца ў актыўную работу па ўмацаванню шклянога завода. Ён удзельнічае ў рабочым кантролі, затым — у правядзенні нацыяналізацыі.

У час першых выбараў у заводскі камітэт тав. Лапота выбіраюць старшынёй. З вялікім запалам прымаецца ён за новую работу. Адначасова працуе начальнікам змены. Яго змена працуе ўзорна, з'яўляецца перадавой. У дзень першай гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі ад гнёту памешчыкаў і капіталістаў, нарком лёгкай прамысловасці СССР узнагародзіў тав. Лапота значком выдатніка лёгкай прамысловасці.

Выступаўшыя характарызавалі тав. Лапота як адданага і чэснага работніка, аўтарытэтнага і чулага таварыша.

Першым узяў слова майстар шклодуў тав. Дэмскі. Ён адклікаецца аб тав. Лапоце як аб дастойным сыну народа. Тав. Дэмскі заклікае выбаршчыкаў 15 снежня аддаць свае галасы за тав. Лапота.

Выступае стары рабочы-шклодуў, цяпер начальнік змены тав. Халцінскі.

— З малых год ведаю тав. Лапота,—гаворыць ён.—На працягу ўсяго свайго жыцця да вызвалення ён, як і бацька яго, жыў у вялікай нястачы. Станіслава Лапота рабочыя ведаюць як актыўнага таварыша, выдатнага начальніка змены.

— Хто яшчэ хоча выступіць?—запытвае старшыня сходa.

Руку падняў зусім стары Нагулевіч. Ён прыўзняўся з свайго месца і пачаў гаварыць:

— Аддамо свае галасы, грамадзяне, за нашага кандыдата. Але вось ёсць у мяне некаторыя заўвагі. Папершае, трэба будучаму дэпутату паклапаціцца аб пабудове дадатковых лазняў. Трэба і пабольш сквераў зрабіць у горадзе.

Пасля сходa выбаршчыкі глядзелі пастаноўку М. Горкага «Васа Жэлезнова» у выкананні рабочых шклозавода.

А. Іваноў.

* * *

У памяшканні Ломжынскага тэатра адбылася сустрэча выбаршчыкаў 16-й выбарчай акругі з кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета Філіпам Іосіфавічам Паповым.

Зал быў перапоўнены. Сюды прышлі рабочыя, члены арцелей, настаўнікі, хатнія гаспадыні. Старшыня акруговай выбарчай камісіі тав. Вадап'янаў адкрыў сход.

Слова атрымала даверапая па выбарчай акрузе тав. Балаева.

— Дэпутат павінен памятаць і ніколі не забываць аб тым,—гаворыць яна,—што ён слуга народа. Вылучаны намі кандыдат у дэпутаты ў абласны Совет тав. Папоў апраўдаў сябе на партыйнай і совецкай рабоце. У дзень выбараў аддадзім свае галасы за нашага кандыдата.

Затым слова прадастаўляецца кандыдату ў дэпутаты сакратару Беластоцкага абкома партыі тав. Папову. Прысутныя з вялікай увагай слухаюць яго прамову. Тав. Папоў расказаў выбаршчыкам сваю аўтабіяграфію. Ад пастуха ён вырас да сакратара абкома партыі. Ён запэўніў выбаршчыкаў, што з чэсцю апраўдае іх вялікае давер'е.

Выступіўшая на сходзе работніца будаўнічага ўчастка тав. Завістоўская сказала:

— Мы жадаем, каб тав. Папоў быў дэпутатам ленінскага тыпу, каб ён трымаўся ленінскай лініі і быў такім-жа праўдзівым, якім быў Ленін. Я заклікаю выбаршчыкаў 15 снежня аддаць свае галасы за тав. Папова.

Выбаршчыкі горача падтрымалі заклік тав. Завістоўскай.

Пасля сходa дэманстрыравалася кінокарціна «Людзі нашага калгаса». Вучні 4-й сярэдняй школы выканалі масавы танец «Гапак».

П. Паўлаў.

* * *

Нядаўна мы пазнаёміліся з сваім кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета па 39-й акрузе тав. Гершковічам.

Сход адкрыў даверапы акругі тав. Траўкін, які расказаў нам аб магутнасці Совецкага Саюза, аб Сталінскай Канстытуцыі, аб кандыдатах, вылучаных партыйнымі, совецкімі і грамадскімі арганізацыямі. Затым слова атрымоўвае тав. Гершковіч. Ён расказаў сваю аўтабіяграфію і пра тое, як узняў стаханаўскі рух на фабрыцы.

З яркай прамовай выступіў выбаршчык тав. Літвінаў, які заклікаў выбаршчыкаў у дзень выбараў 15 снежня аддаць свае галасы за кандыдата ў дэпутаты тав. Гершковіча.

В. Зарэцкі,

выбаршчык 39 акругі па выбарах у Беластоцкі горсовет.

* * *

У памяшканні 5-й беластоцкай школы адбыўся сход выбаршчыкаў 45 акругі, прысвечаны сустрэчы з кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных Марыяй Аляксандраўнай Галенка. Сход адкрывае старшыня акруговай выбарчай камісіі тав. Ражко. Ён гаворыць аб вялікай Сталінскай Канстытуцыі, аб шчасці выбіраць прадстаўнікоў народа ў органы Совецкай улады. Ён гаворыць аб кандыдаце ў гарадскі Совет, якога вылучылі калектывы студэнтаў і выкладчыкаў педвучылішча і рабфака.

— Марыя Галенка яшчэ маладая, — гаворыць тав. Ражко, — але за плячыма яе немалы шлях рэвалюцыйнай барацьбы. Яна жыла ў нястачы, яна бачыла, як увесь працоўны народ стагнаў пад прыгнётам польскіх капіталістаў і памешчыкаў. Яна рвалася да барацьбы, бо верыла ў перамогу працоўных; яе праследвала і арыштоўвала дэфензіва, але гэта не магло зламаць яе волі.

Слова прадастаўляецца тав. Галенка.

— Таварышы! — пачынае сваю прамову Марыя Галенка,—У краіне Советаў адкрыты дзверы для шчаслівага жыцця працоўных. У капіталістычных краінах мільёны працоўных не маюць работы і хлеба. Моладзь не мае там ніякай перспектывы. Так было і ў панскай Польшчы. А цяпер кожны з нас гардзіцца вялікімі правамі совецкага грамадзяніна.

Цяпер скажу пра шлях свайго жыцця. Нарадзілася я ў сям'і бедняка-селяніна ў вёсцы Дубіны, зараз Гайнаўскага раёна, Брэсцкай вобласці. Жылі мы бедна, і навокал я бачыла, як пакутваў працоўны народ пад панскім прыгнётам. Але я сустрэла людзей, якія гаварылі, што ёсць дарога да лепшага жыцця, ёсць краіна, дзе няма нядолі і прыгнечання, дзе шчасліва жывуць свабодныя народы — гэта вялікая краіна Советаў. Я ўступіла тады ў комсамол, каб змагацца за справу вызвалення ад капіталістычнай няволі.

Мне радасна зараз, што недарма была наша барацьба, перамагла справядлівая справа працоўных, совецкая ўлада прынесла нам шчаслівае жыццё. Мне радасна, што народ аказаў мне такое вялікае давер'е, вылучыўшы маю кандыдатуру ў органы совецкай улады. У падзяку за гэта давер'е я буду старацца ўсімі сіламі апраўдаць яго на практычнай справе.

Затым выступае даверапы тав. Сташэўскі. Ён гаворыць:

— Чаму мы аказалі такое давер'е тав. Галенка? Таму, што яна ўсім сэрцам аддана працоўнаму народу, з юных год змагалася за лепшую будучыню. Пасля прыходу Чырвонай Арміі яна адразу была выбрана ў сялянскі камітэт, а потым дэпутатам Народнага Сабрання. Зараз яна ў вучылішчы лепшая студэнтка, актыўна ўдзельнічае ва ўсіх грамадскіх мерапрыемствах. Сваёй работай, сваімі паводзінамі яна паказала, што дастойна вялікага народнага давер'я.

З прамовамі выступілі: выбаршчыца Мэблевай вуліцы тав. Клепацкая, студэнт педвучылішча тав. Ялоза, ад калектыва рабфака тав. Кшэпіцкі, выбаршчык тав. Катліцкі і кіраўнік агіткалектыва 4-га ўчастка тав. Савін.

У заключэнне студэнты педвучылішча выступілі з мастацкай самадзейнасцю.

І. Клінаў.

Маладыя актывісты выбарчай кампаніі

Комсамольскія арганізацыі Дамбраўскага раёна аказваюць вялікую дапамогу ў справе падрыхтоўкі да выбараў у мясцовыя органы ўлады. Дзесяткі юнакоў і дзяўчат працуюць прапагандыстамі, агітатарамі, чытчыкамі і бяседчыкамі. 60 лепшых прадстаўнікоў комсамольскай арганізацыі з'яўляюцца членамі выбарчых камісій.

Многія комсамольцы паказваюць прыклады прапагандысцкай работы. Яны ўмела нясуць палкія словы бальшэвіцкай праўды ў масы. Добра працуе агітатарам тав. Бенская. У сваіх дзесяці дварах яна з выбаршчыкамі правяла 9 заняткаў. Выбаршчыкі вывучылі Сталінскую Канстытуцыю і выбарчы закон. Акрамя таго ёю праведзена некалькі гутарак аб міжнародным становішчы, а таксама гутарка аб сталінскім блоку комуністаў і беспартыйных. Перад кожнымі заняткамі тав. Бенская ўважліва рыхтуецца: чытае літаратуру, газеты, журналы.

Днямі ў раённым цэнтры быў праведзен сход маладых выбаршчыкаў, на якім прачытан даклад на тэму «Сталінская Канстытуцыя і совецкая моладзь».

Вялікую работу праводзяць комсамольцы па культурнаму абслугоўванню выбаршчыкаў. У раёне створана 9 самадзейных мастацкіх калектываў, якія з поспехам выступаюць перад выбаршчыкамі.

Напярэдадні дня выбараў комсамольцы раёна дапамагаюць выбарчым камісіям яшчэ раз удакладніць спіскі выбаршчыкаў, лепш абсталяваць памяшканні выбарчых участкаў.

Б. Голубаў,

сакратар Дамброўскага райкома ЛКСМБ.

Поспехі калгасаў Сапоцкінскага раёна

У красавіку 1940 года ў Сапоцкінскім раёне арганізаваліся 6 калгасаў. З першых дзён арганізацыі калгасаў класава-варожыя элементы пускалі розныя чуткі, агітавалі калгаснікаў, каб яны выпісваліся з калгасаў. Але калгаснікі давалі рашучы адпор антысовецкім элементам, не паддаваліся на правакацыйныя вылазкі кулакоў.

За 8 месяцаў калгасы арганізацыйна і гаспадарча ўмацаваліся. У кожным калгасе створаны малочнатаварныя фермы, а ў некаторых — свінагадоўчыя і аўцагадоўчыя фермы. З 129 гаспадарак, аб'еднаных у калгасы, 111 маюць зараз уласных кароў. Свіней мае кожны калгасны двор. Калгаснікі—гэта ў мінулым батракі і беднякі, якія не мелі кароў. Былыя батракі, якія ад цямна да цямна працавалі на памешчыцкіх палях за кавалак хлеба, цяпер жывуць сапраўды радасным жыццём.

У калгасе імені Калініна на кожны працадзень атрымліваюць па 6,5 кілограма зярна. Калгаснік сельскагаспадарчай арцелі «Вызваленая Беларусь» Іосіф Навікоўскі за 8 месяцаў выпрацаваў 430 працадзён. Па папярэдніх падліках ён атрымае 2.150 кілограмаў зярна, 2.220 кілограмаў бульбы, 860 кілограмаў кармоў для жывёлы і 1.000 рублёў грашыма. У мінулым Навікоўскі — батрак.

Былы батрак Адам Новік, зараз калгаснік калгаса «Ударнік», выпрацаваў больш 580 працадзён, на якія атрымае 1.998 кілограмаў зярна, 2.635 кілограмаў бульбы, 1.713 рублёў грашыма і больш 1.500 кілограмаў кармоў. Член сельскагаспадарчай арцелі «Першае Мая» Лакота — былы патомствены пастух, у калгасе выпрацаваў 365 працадзён. На гэтыя працадні Лакота атрымаў авансам 13 цэнтнераў зярна, 97 пудоў бульбы і 140 пудоў кармовых буракоў.

Можна назваць яшчэ дзесяткі людзей, якія толькі за 8 месяцаў калгаснага жыцця сталі заможнымі калгаснікамі. Яны атрымалі столькі хлеба, што яго хопіць на 2 годы.

За кароткі час у калгасах выраслі дзесяткі стаханаўцаў. Даярка калгаса «Новае жыццё» Сцепаніда Сапчук захавала поўнасцю ўвесь прыплод маладняка. Яна выгадавала 13 цялят. Па-стаханаўску працуюць многія калгаснікі. У час пасяўной кампаніі добрыя ўзоры работы паказвалі калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені 22 верасня Калецкі, Ермалаеў і Тэлешынскі. Яны перавыконвалі свае нормы ў тры разы. Узорна працуе калгасніца-брыгадзір Юзефа Якімовіч. За прыкладную работу калгаснікі вылучылі яе кандыдатам у дэпутаты ў абласны Совет дэпутатаў працоўных.

Нядаўна ў раёне адбылася нарада старшынь і рахункаводаў калгасаў разам з актывам. Удзельнікі нарады расказвалі аб сваіх поспехах. Ад усяго сэрца яны дзякавалі партыю, совецкую ўладу і вялікага Сталіна за тое, што яны ўказалі батракам і беднякам правільны шлях, забяспечылі ім шчаслівае, радаснае жыццё.

—Я з 7 год быў пастухом у памешчыка, — гаварыў на нарадзе калгаснік сельскагаспадарчай арцелі «Першае мая» тав. Лакота. — Не салодкім было маё жыццё. А зараз у калгасе я не ведаю нястачы. За 8 месяцаў я выпрацаваў 365 працадзён. Я атрымаю столькі хлеба, колькі ў сваім жыцці яшчэ не меў.

— У калгасе я адчуў сябе сапраўдным гаспадаром жыцця,—заявіў калгаснік калгаса «Новае жыццё» Матвейчык.—У мяне 9 душ сям'і. Раней, пры ўладзе памешчыкаў і капіталістаў, у мяне ніколі не хапала свайго хлеба. Я ішоў пазычаць яго ў кулакоў і ксяндза. Зараз я маю ўдосталь свайго хлеба і больш ў пазычкі да кулакоў і ксяндза не пайду.

Былыя батракі і беднякі выйшлі на шырокую дарогу шчаслівага і радаснага жыцця.

І. Хруцкі.

Абмен вопытам

Клінцоўскія тэкстыльшчыкі расказваюць аб сваіх вытворчых перамогах, аб сваіх знатных людзях—стаханаўцах. Яны заклікаюць тэкстыльшчыкаў Беластока аднадушна галасаваць за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.



Стаханаўка ткачыха клінцоўскай фабрыкі імені Леніна П. Гарбатоўская сістэматычна перавыконвае нормы выпрацоўкі.

Фота К. Саліта.

Комуністы ў авангардзе

Наша фабрыка імені Комінтэрна выканала план за кастрычнік па пражы на 105,5 процанта, па сураўю — на 102,6 процанта, па гатоваму тавару—на 120 процантаў. Гэтаму ў велізарнай меры садзейнічала соцыялістычнае спаборніцтва, масавы стаханаўскі рух рабочых і работніц. У авангардзе спаборніцтва ўсёй вытворчасці ідуць комуністы і комсамольцы. Член ВКП(б) тав. Чумакова, якая працуе прадзільшчыцай, выканала кастрычніцкі план на 111,3 процанта, член партыі апаратчыца тав. Перэднева—на 113,4 процанта, галоўны майстар прадзільнага аддзела, член ВКП(б), ордэнаносец тав. Каленікаў—на 105,5 процанта.

Зараз калектыў рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых фабрыкі разгарнуў соцыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне гадавой вытворчай праграмы. 6-га лістапада намеснік народнага камісара тэкстыльнай прамысловасці СССР тав. Хазан прыслала тэлеграму наступнага зместу:

«Віншую калектыў фабрыкі з дасягнутымі поспехамі к XXIII гадавіне Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. Выказваю ўпэўненасць у далейшым забеспячэнні перавыканання гадавога плана».

На тэлеграму намесніка наркома комінтэрнаўцы адказваюць канкрэтнымі справамі. Так, напрыклад, на 10 лістапада план выканан па пражы на 103,6 процанта, сураўю—на 106,2 процанта, па гатоваму тавару —на 102,4 процанта. Выпушчана першым сортам сукна 93,25 процанта замест 91 процанта па плану. Апаратчыцы тт. Якаўлева, Непцегіна, Кавалёва, Кутыркіна, прадзільшчыцы тт. Нікулічкіна, Чарнабаева, Чумакова і Марозава выконваюць норму ад 120 да 139 процантаў. Ткачыха тав. Гапонава дала 153 проценты нормы. Гэтыя работніцы паказваюць усяму калектыву бліскучыя ўзоры працы, натхняючы сваім прыкладам таварышоў.

Калектыў фабрыкі, узначальваемы сваім комуністычным авангардам, поўны гарачай любві к радзіме, паспяхова змагаецца за датэрміновае выкананне гадавога плана.

В. Бляўскі,
намеснік дырэктара фабрыкі імені Комінтэрна.

Садружаства спецыялістаў і стаханаўцаў

На вопыце Клінцоўскай суконнай фабрыкі імені Кастрычніцкай рэвалюцыі, яе апаратна-прадзільнага цэха, мне хацелася-б паказаць, як стваралася садружаства ў рабоце спецыялістаў і стаханаўцаў.

Калі ўважліва прыглядаешся да работы прадзільшчыка, то заўважаеш, што галоўным тормазам з'яўляецца абрыўнасць нітак па сельфактары. Прычым вялікая абрыўнасць не толькі зніжае выпрацоўку чыста механічна, але і стварае нервозны настрой ва ўсіх працуючых на машыне. Паяўляецца так званая непаспяваемасць.

Вось тут і павінен прысці на дапамогу спецыяліст, як памочнік стаханаўца ў стварэнні яму такіх вытворчых умоў, якія давалі-б магчымасць і добра працаваць і развіваць далей сваё майстэрства.

У барацьбе з абрыўнасцю мы пайшлі па лініі паляпшэння састава змескі, дакладнай падрыхтоўкі яе камплектаў, большага іх перамешвання, змянення рэжыму, замасліваня і т. д. У кардачасанні былі перагледжаны ўсе апараты—правільна падабрана гарнітура, уведзены графікі, чысткі кожнай машыны ў залежнасці ад выпрацоўваемага на ёй сорту.

Гэта дало прыкметнае зніжэнне абрыўнасці. У рабочых утварыўся рэзерв свабоднага часу, калі не трэба прысучаць абарваўшуюся нітку. Папрацаваўшы так некаторы час, мы паставілі перад сабой пытанне: а ці нельга павысіць прадукцыйнасць машын не толькі супроць першапачатковага становішча, але і ў параўнанні з планам?

Перад спецыялістамі, у сваю чаргу, паўстала пытанне аб стварэнні такіх умоў у рабоце абсталявання, пры якіх машыны і на вялікіх хуткасцях працавалі-б бездакорна. Майстар прадзільнага цэха А. І. Салаўёў унёс прапанову перавесці на шарыкападшыпнікі бляшаныя барабанчыкі, якія даюць рух верацёнам, чым палепшыцца ход машыны, а для большай дакладнасці—зрабіць гэтыя шарыкападшыпнікі рухаючыміся.

Паспрабавалі правесці гэтае мерапрыемства на адной машыне, далі ёй павялічаную на 15 процантаў хуткасць—і вынік атрымаўся зусім здавальняючы. Пасля гэтага перавялі на павялічаную хуткасць усе машыны.

Назіраючы за работай лепшых стаханаўцаў, прыслухоўваючыся да іх патрабаванняў, мы знайшлі дадатковыя магчымасці павышэння прадукцыйнасці працы і абсталявання, павялічылі даўжыню ніткі на пачатку на 10—15 процантаў, чым і стварылі лепшыя ўмовы ў рабоце ткачоў. Сістэматычна павышаючы патрабаванні да апаратнага аддзела, удасканальваючы рабочыя прыёмы, скарачаючы час на прысучку бабін і інш., мы дабіліся таго, што выпрацоўка ў 120 процантаў нормы і больш цяпер у нас не рэдкасць, а невыконваючых норму не стала зусім.

А. Рачкоў,
галоўны інжынер фабрыкі імені Кастрычніцкай рэвалюцыі.

* * *

Клінцы — горад тэкстылю. Чатыры суконных фабрыкі, пенькапрадзільная фабрыка, ткацкія цэхі горпромкамбіната — вось асноўныя вядучыя галіны соцыялістычнай прамысловасці. Сёння з старонак нашай газеты клінцоўскія тэкстыльшчыкі расказваюць аб сваёй барацьбе за выкананне вытворчых планаў.

Гэта старонка арганізавана для нас рэдакцыяй Клінцоўскай гарадской газеты «Труд».

Галасуйце аднадушна за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных

ТАВАРЫШЫ ТЭКСТЫЛЬШЧЫЦЫ БЕЛАСТОКА!

У дзень, калі вы ўпершыню на сваёй вызваленай зямлі выбіраеце дэпутатаў у мясцовыя Советы, пасылаеце сваіх лепшых сыноў і дачок у органы совецкай улады, мы, работніцы-тэкстыльшчыцы Клінцоўскай суконнай фабрыкі імені Леніна, шлём вам сваё палкае большэвіцкае прывітанне і найлепшыя пажаданні!

Нямнога больш месяца назад мы разам з вамі, разам з усёй краінай Советаў святкавалі XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. Дваццаць тры годы мы жывём шчаслівым свабодным жыццём, не ведаем гнёту эксплаататараў, будуем найвялікшы будынак комунізма.

Але мы ні на адну мінуту не забываем аб капіталістычным акружэнні. І гэта абавязвае нас яшчэ больш прадукцыйна працаваць, мацаваць абараназдольнасць сваёй радзімы.

Вялікае пролетарскае свята Кастрычніка рабочыя, работніцы, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя нашай фабрыкі разам з працоўнымі горада і ўсяго Совецкага Саюза адзначылі новым уздымам працоўнага энтузіязма. Мы значна перавыканалі кастрычніцкае заданне, далі звыш плана не адну сотню метраў дабротных тканін. Нашы перадавыя людзі — стаханаўцы і стаханаўкі—паказалі ў гэтыя дні новыя прыклады працоўнай доблесці. Ткачыхі-многастаночніцы, якія працуюць на 3 — 4 станках, тт. Карацец, Гарбатоўская, Трэгубава, Барысенка, Выдра выконваюць нормы на 116 — 130 процантаў. Прадзільшчыцы тт. Гапонава, Осадчая, апаратчыцы тт. Талкачова, Зільберман выконваюць заданне на 120 — 125 процантаў, працуюць без браку. Не пералічыць усіх майстраў высокапрадукцыйнай працы.

Наша задача — не супакойвацца на дасягнутым, а працаваць сёння лепш, чым учора. Гэтаму абавязваюць нас інтарэсы радзімы, інтарэсы працоўнага чалавецтва ўсяго свету. Мы яшчэ вышэй узнімем сцяг соцыялістычнага спаборніцтва, арганізуем яшчэ больш дружную стаханаўскую работу.

Калектыў рабочых і спецыялістаў паставіў перад сабой пачотную задачу — выканаць да канца года план па пражы на 118 процантаў, па сураўю—на 118,7, па гатоваму тавару — на 124 проценты. Акрамя гэтага мы абавязаліся павысіць прадукцыйнасць працы на 10 процантаў, дабіцца выканання нормы выпрацоўкі ўсімі рабочымі асноўных прафесій — апаратчыцамі, вінтоўшчыцамі, прысучальшчыцамі і ткачамі, даць першасортных тканін не менш 91 процанта замест 88,52 процанта па плану.

Выканаць абавязацельствы дапамогуць нам большэвіцкая арганізаванасць і дысцыпліна, няўхільнае выкананне Ўказаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня 1940 года.

У мінулым годзе, прыкладна, у гэты-ж час праходзіла і ў нас выбарчая кампанія ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Яна суправаджалася небывалым уздымам палітычнай і творчай актыўнасці мас. Сталінскі блок комуністаў і беспартыйных атрымаў бліскучую перамогу. Выбары з'явіліся грандыёзнай усенароднай дэманстрацыяй згуртаванасці працоўных вакол партыі, совецкага ўрада, вакол правадыра народаў таварыша Сталіна. Мы заклікаем вас аднадушна галасаваць за сталінскі блок комуністаў і беспартыйных.

Мы ўважліва сочым, дарагія таварышы, за вашым жыццём і вашымі поспехамі, гардзімся вашымі дасягненнямі, як сваімі ўласнымі. Наша агульнае імкненне — зрабіць іх яшчэ большымі, множыць багацці краіны Советаў. Да высокай прадукцыйнай стаханаўскай працы заклікаем мы вас, дарагія таварышы.

Партыя і ўрад стварылі тэкстыльшчыкам усе ўмовы для добрай работы. Мы, жанчыны краіны Советаў, асабліва адчуваем на сабе сталінскія клопаты, яны відаць ва ўсім — у роўнаправнай працы, у праве на адпачынак, асвету, у шчаслівым і радасным жыцці нашых дзяцей. Бязмежнай любоўю і самаадданай працай адплоцім мы радзіме і нашаму правадыру за клопаты аб нас.

Просім вас падзяліцца з намі аб вашым жыцці і рабоце, аб вашых поспехах, перспектывах, аб усіх дасягненнях.

Стаханаўкі Клінцоўскай тонкасуконнай фабрыкі імені Леніна:

Дастасава, Куцэнкова, Крукава, Трэгубава, Казлова, Зільберман, Гапонава, Сідарэнка, Усачова, Гарошка, Кастакова, Гарбатоўская, Кузьміна, Джурко, Мельнікава, Іваненка і іншыя.

Мае поспехі

Усяго шэсць год таму назад я была вясковай дзяўчынай. Падумаўшы над сваім будучым, я паступіла ў школу фабрычна-заводскага вучнёўства. Пасля двух год вучобы вышла з школы кваліфікаванай ткачыхай. На фабрыку прышла, як ва ўласны дом. Калектыў акружыў мяне ўвагай, і я не доўга адчувала сябе навічком. На практычнай рабоце хутка асвоілася з акружаючай абстаноўкай. Адразу адчула, чым жывуць рабочыя, работніцы, камандзіры вытворчасці. Я імкнулася ўсё к аднаму: даць больш выпрацоўкі і лепшай якасці. Гэта стала для мяне кіруючым правілам у рабоце.

Праз год пасля прыходу на фабрыку я з двух простых ткацкіх станкоў перайшла на два складаных, затым праз 5 месяцаў стала абслугоўваць тры складаных станкі. Прывяду некалькі лічбаў, якія расказваюць аб маіх вытворчых поспехах.

Пяць разоў правяралі пры дапамозе хранаметражу працягласць маіх рабочых прыёмаў. З кожным разам паляпшаліся мае паказчыкі. На змену чаўнака пры дапрацоўцы пачатку, без шукання ніткі, даецца 3,5 секунды. Я гэту аперацыю выконваю цяпер за 1,61 секунды. Змяняю чаўнок з шуканнем ніткі за 7,2 секунды, замест 15, 16 па норме. На змену чаўнака пры абрыве ўтку я затрачваю ўдвая менш часу. Ліквідую абрыў асновы за 10,14 секунды, замест 16 па норме. На п末праўку і распутванне асновы ў мяне ўходзіць 16,7 секунды замест 30 секунд і т. д.

Зэканомленыя секунды складваюцца ў мінуты, мінуты — у рабочыя гадзіны і дні. Гэта і называецца ўмець цаніць фактар часу, што з'яўляецца неабходнай умовай стаханаўскай работы. За лік зэканомленага часу я дабілася высокай выпрацоўкі, бездакорнай якасці. На месяц раней тэрміну я выканала план мінулага года. Выпрацоўваючы трыко, я выконваю норму на 114—120 процантаў.

З прыходам на фабрыку не астаўляла думкі аб вучобе. Усе ўмовы для павышэння сваіх ведаў у нас ёсць. Два годы таму назад я стала наведваць вячэрняе аддзяленне мясцовага тэкстыльнага тэхнікума і цяпер, без адрыву ад вытворчасці, вучуся на тэхніка па ткацтву. Работа не перашкаджае вучобе, вучоба — рабоце, яны ўзаемна дапаўняюць адна другую.

Як і на рабоце, я строга ўлічваю і планірую кожную гадзіну свайго вольнага часу. Мне хапае часу і для выканання комсамольскіх даручэнняў, і на наведванне тэатра і кіно, і на чытку мастацкай і палітычнай літаратуры, газет і журналаў.

У мінулым годзе калектыў аказаў мне высокае давер'е, вылучыўшы кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных. Зараз я — дэпутат. Я з гордасцю выконваю свае дэпутацкія абавязкі.

Як не радавацца такому жыццю! Гэтым жыццём мы абавязаны радзіме, нашаму правадыру таварышу Сталіну, адкрыўшаму для нас, совецкіх людзей, шырокую дарогу ў жыццё.

Паліна Гарбатоўская,
ткачыха-многастаночніца фабрыкі імені Леніна.



Стаханаўка вінтоўшчыца Клінцоўскай фабрыкі імені Ногіна С. Крукава выконвае нормы на 122 проц.

Фота К. Саліта.

З гордасцю нашу званне стаханаўкі

Пачатак маёй працоўнай дзейнасці супаў з першымі гадамі совецкай улады. Больш дваццаці год працую я на адным прадпрыемстве—на Клінцоўскай суконнай фабрыцы імені Комінтэрна. Прышла я сюды чорнарабочай, а цяпер абслугоўваю сельфактар. Спецыяльнасць вінтаўшчыцы асвоіла пяцірэнна, ведаю машыну. У многім гэтаму дапамагла тэхнічная вучоба. Не задавальняючыся тым, што здала тэхмінімум на «выдатна», я працягваю павышаць сваю кваліфікацыю. З месяца ў месяц перавыконваю нормы выпрацоўкі, пража мая добрай якасці. Успамінаецца мне 1935 год—пачатак стаханаўскага руху. Прыклад наватараў моцна на мяне тады ўздзейнічаў. Я першая ў прадзільным аддзеле паказала ўзор ушчыльнення працы--стала абслугоўваць сельфактар з адной работніцай замест двух.

У мінулым годзе я выпрацавала звыш плана 4 тысячы кілограмаў пражы. Цяпер мая выпрацоўка дасягае 135 процантаў нормы.

Як дасягнут поспех, што ляжыць у яго аснове? Галоўным чынам—дысцыплінаванасць, правільная арганізацыя працы.

Абавязкі паміж мной і маёй памочніцай-прысучальшчыцай строга размежаваны. Галоўнае, чаго мы стараемся пазбегнуць--гэта дрэннага прысучвання нітак. Папярэджваючы абрыўнасць, павышаем выпрацоўку, зніжаем колькасць крутых канцоў. Невыпадкова на маёй машыне прастоі нязначныя. Пры разладцы яе рэдка прыбягаю к дапамозе памочніка майстра, а спраўляю сама. Каб непаладак было менш, прыходжу загадзя ў цэх, у гутарцы са зменшчыцай даведваюся, як працаваў сельфактар, які ішоў нумар партыі пражы. Запасаюся роўніцай, падрыхтоўваю скрынкі для пражы, масла для змазкі машыны, заліваю яго ў галоўны вал галоўкі, у верацёны, цыліндры—і толькі тады, калі пераканаюся, што ўсё ў парадку, прыступаю да работы.

Але працаваць самой добра—гэтага яшчэ недастаткова для стаханаўкі. Мой доўг—падцягваць адстаючых, перадаваць ім свой вопыт. Я абучыла ўжо не адну работніцу стаханаўскім метадам працы.

Марыя Чумакова,
стаханаўка-прадзільшчыца фабрыкі імені Комінтэрна.

КЛІНЦЫ--ГОРАД ТЭКСТЫЛЮ


Гісторыя Клінцоў адносіцца да таго далёкага часу, **«когда Россия молодая в бореньях силы напрягая, мужалась с гением Петра»**, гераічнымі намаганнямі выбіралася з цемры сярэдневякоўя, вяла лютую барацьбу са шведамі. За горадам яшчэ захаваліся невысокія курганы, зарослыя рэдкімі соснамі, пад якімі даўно спарахнелі косці няпрошаных гасцей, пранікшых на рускую зямлю. Амаль зраўняліся з зямлёй і акопы часоў грамадзянскай вайны, сведкі баёў легендарнага Шчорса за Клінцы.

Горад акружан кальцом векавога лесу. Тут два стагоддзі таму назад, у дрымучых лясах, хаваліся раскольнікі. Яны і заснавалі горад. За два стагоддзі Клінцы аформіліся ў горад тэкстыльных фабрык, шырока праславіўшыхся па ўсёй краіне сваімі сукнамі і кручонымі вырабамі. Але да 1917 года Клінцы аставаліся захалусным пасадам былой Чэрнігаўскай губерні — гняздом купцоў і фабрыкантаў.

За 210 год свайго існавання горад не змог дасягнуць таго, чаго ён дабіўся за 23 годы совецкай улады. Горад вырас у тры разы, стаў адным з цэнтраў совецкай тэкстыльнай прамысловасці.

Але акрамя дабротных сукан горад выпускае на совецкі рынак і іншыя тавары, пачынаючы ад дзіцячых цацак і канчаючы складанымі тэкстыльнымі машынамі, абуткам, гатовым адзеннем, мебляй і т. д. Больш чым у 100 мільёнаў рублёў у цэнах 1926-27 года ацэньваецца гэтая прадукцыя. На жыллёвае будаўніцтва, комунальную гаспадарку, дабрабыт, на культурныя ўстановы штогодна выдаткоўваюцца мільёны рублёў. Велізарны Дом Советаў узвышаецца ў цэнтры горада, а побач шматпавярховыя дамы, якія займаюць цэлыя кварталы — дамы рабочых, Дом тэкстылю, тры новых сярэдніх школы, новы будынак фабрычна-заводскага вучылішча, пяньковага тэхнікума і многа іншых прыгожых збудаванняў. Іх дапаўняюць новыя рабочыя пасёлкі.

Але галоўнае, чым гардзіцца горад, — гэта яго людзі. Штодзённа на прадпрыемствах ля станкоў і машын займаюць свае месцы каля пятнаццаці тысяч рабочых. Толькі на фабрыках трэста «Клінцсукно» і пенькапрадзільнай фабрыцы імені Дзяржынскага працуюць каля 4 тысяч майстраў стаханаўскай працы. У Клінцах першай у суконнай прамысловасці ткачыха Юлія Чыжэўская стала абслугоўваць 6 ткацкіх



На здымку: стаханаўкі Клінцоўскай фабрыкі імені Комінтэрна, перавыконваючыя нормы выпрацоўкі (злева направа): Н. Федзіна (вінтоўшчыца), А. Ігнацьева (ткачыха), А. Калмыкова (ткачыха), Р. Ганжа (вінтоўшчыца).

Фота К. Саліта.

станкоў. Два дзесяткі год таму назад сярод ткачоў рэдка можна было сустрэць жанчыну, зараз-жа ткачых у нас сотні.

На прадпрыемствах сотні спецыялістаў інжынераў, тэхнікаў, якія займаюць камандныя пасты. Гэта дзеці рабочых і сялян, працоўнай інтэлігенцыі. Многія з іх атрымалі асвету ў мясцовых тэхнікумах. Суконнай фабрыкай імені Кастрычніцкай рэвалюцыі кіруе малады тэхнік Віктар Іванавіч Салаўёў. Суконнай фабрыкай імені Комінтэрна кіруе былая работніца гэтай фабрыкі, скончыўшая прамысловую акадэмію, Ефрасіння Міхайлаўна Нехедава. Ткацкі цэх буйнейшай суконнай фабрыкі імені Леніна ўзначальвае былы ткач, узнагароджаны ордэнам «Знак почета», Сяргей Карпавіч Бяззубенка. Памочнікам галоўнага інжынера фабрыкі працуе былы ткач, у гэтым годзе вышаўшы з сцен прамысловай акадэміі, Дзмітрый Паўлавіч Джура.

Былая ткачыха-стаханаўка фабрыкі імені Ногіна Ксенія Захараўна Шуршына, якая кіравала гэтай фабрыкай, выбрана дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР, узнагароджана ордэнам Леніна. Зараз тав. Шуршына вучыцца ў Промакадэміі ў Маскве. У горадзе 10 таварышоў узнагароджаны ордэнамі і медалямі Саюза ССР, многа выдатнікаў соцыялістычнага спаборніцтва ўзнагароджаны спецыяльнымі значкамі наркаматаў. Кіруюць горадам, партыйнымі, совецкімі, гаспадарчымі арганізацыямі людзі, вырасшыя на яго прадпрыемствах.

Дзякуючы стаханаўскаму руху з года ў год расце валавы выпуск прадукцыі, павышаецца прадукцыйнасць працы. За 5 апошніх год выпуск валавой прадукцыі прадпрыемстваў саюзнага і рэспубліканскага значэння вырас удвая, а прадпрыемстваў гарадскога значэння—амаль у тры разы. За гэты-ж час прыбавілася 2.100 рабочых, а лік стаханаўцаў павялічыўся амаль у 20 разоў. Бурны рост прадукцыйнасці працы суправаджаўся ростам заработнай платы. Сярэднемесячны заработак клінцоўскага тэкстыльшчыка за апошнія 5 год вырас амаль у два разы. Заработак стаханаўцаў значна вышэй.

Шчаслівым жыццём жыве дзетвара. Кожны дзень каля васьмі тысяч школьнікаў садзяцца за парты, іх абучае больш 220 вопытных педагогаў. Адкрыта спецыяльная сярэдняя школа для дарослых. Не пакідаючы роднага горада, можна працягваць асвету ў тэкстыльным і пяньковым тэхнікуме, у фармацэўтычнай і медыцынскай школе, педагагічным вучылішчы. У горадзе 15 клубаў з шасцю гукавымі кіноўстаноўкамі, стацыянарны драматычны тэатр, гукавы кінотэатр, дом народнай творчасці, дом піонераў, прыгожы стадыён, водная станцыя і многа іншых ачагоў культуры.

Такі далёка няпоўны пералік фактаў і лічбаў, якія сведчаць аб росквіце Клінцоў пасля Кастрычніка. Кіпучая дзейнасць, плённая работа не спыняецца ні на мінуту. Дасягнутае сёння служыць асновай для яшчэ больш грандыёзных планаў на будучае. Заканчваецца будаўніцтва новай прадзільнай фабрыкі, рэканструіруюцца і пашыраюцца старыя прадпрыемствы, будуюцца новыя шматпавярховыя жыллёвыя дамы, катэджы для рабочых і спецыялістаў. Горад жыве адзіным жыццём з усёй вялікай краінай Советаў. Ён ідзе цвёрдым, упэўненым крокам насустрач поўнаму таржаству комунізма.

Г. Ліўшыц,
М. Маргелін.

У апошнюю гадзіну

БАМБАРДЫРОЎКА БІРМІНГАМА

БЕРЛІН, 12 снежня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што мінулай ночу галоўнай мэтай германскай авіяцыі быў горад Бірмінгам. Налёт быў надзвычай моцным і працягваўся ўсю ноч. Налёт на Бірмінгам з'яўляецца самым працяглым з усіх налётаў на англійскія гарады.

ДЗЕЯННІ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН, 12 снежня. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе, што ў ноч на 12 снежня англійскія самалёты бамбардыравалі на акупіраванай Германіяй тэрыторыі парты, адкуль Германія рыхтуецца да ўтаржэння ў Англію, і рад аэрадромаў. У Заходняй Германіі англійскія самалёты бамбардыравалі электрастанцыі, докі і чыгуначныя таварныя склады.

КАМЮНІКЕ КАМАНДАВАННЯ АНГЛІЙСКІХ СУХАЗЕМНЫХ СІЛ НА БЛІЖНІМ УСХОДЗЕ

ЛОНДАН, 12 снежня. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, англійскія перадавыя часці ў Заходняй пустыні знаходзяцца ў датыканні з італьянскімі сіламі, працягваючымі адступленне ў заходнім напрамку. Па апошніх звестках, лік палонных, узятых англічанамі, правышае 20 тысяч чалавек. Захоплены таксама танкі, артылерыйскія гарматы і іншае ваеннае снаражэнне. Паміма трох генералаў узяты ў палон сотні італьянскіх афіцэраў.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў АЛБАНІІ

БЕЛГРАД, 12 снежня. (ТАСС). Па паведамленню газеты «Палітыка», учора на паўночным участку фронта з-за дрэннага надвор'я баёў не было. На гарах Камна і Мокра таўшчыня снежнага пакрова звыш 1 метра.

Грэчаскія войскі, размешчаныя на паўночны захад ад Паградзеца, дзейнічаюць дробнымі атрадамі, прасоўваючыся ўперад. Атакі вытвараюцца звычайна ўночы. Грэчаскія салдаты карыстаюцца выключна ручнымі гранатамі і кінжаламі. Асобныя часці левага фланга прабіліся ў даліну ракі Шкумба, пазбегнуўшы пры гэтым засады і акружэння. Цыркулююць чуткі, што атрады грэкаў знаходзяцца ля сяла Радокала. Сваімі дзеяннямі ў даліне ракі Шкумба грэкі пагражаюць італьянскім пазіцыям на гары Мокра.

ІНТЭРВ'Ю ГЕБЕЛЬСА

БЕРЛІН, 12 снежня. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, у інтэрв'ю замежным журналістам, прыбыўшым з Парыжа, міністр прапаганды Гебельс закрануў пытанне аб зыходзе вайны. Гебельс адзначыў, што англічане няспынна запэўнялі, быццам яны абаронены супроць немцаў пралівам і германскае ўтаржэнне немагчыма. Па гэтаму поваду Гебельс напомніў, што Англія лічыла і лінію Мажыно неправадалімай абаронай супроць магчымага германскага ўтаржэння, аднак падзеі ва Францыі паказалі, што лінія Мажыно не апраўдала ўскладаўшыяся на яе надзеі.

У сувязі з гэтым добра інфармаваныя германскія кругі падкрэсліваюць, што паведамленні, згодна якім міністр Гебельс быццам-бы гаварыў аб непасрэдна прадстаячым утаржэнні германскіх войск у Англію, пазбаўлены ўсякай падставы.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 12 снежня. (ТАСС). У камюніке міністэрства авіяцыі паведамляецца, што дзеянні германскай авіяцыі ў ноч на 12 снежня былі сканцэнтраваны ў раёне аднаго з гарадоў Цэнтральнай Англіі. Налёт на гэты горад насіў надта жорсткі характар. Бамбардыроўка працягвалася ўсю ноч. Узнікла некалькі пажараў.

У іншых раёнах Англіі актыўнасць непрыяцельскай авіяцыі была менш значнай.

Англійскія ваенна-паветраныя сілы ў ноч на 12 снежня бамбардыравалі прамысловыя прадпрыемствы Рэйнскай вобласці.

Амерыканскія паведамленні

НЬЮ-ЙОРК, 12 снежня. (ТАСС). Газета «Нью-Йорк таймс» паведамляе, што ў ноч на 12 снежня германская авіяцыя праяўляла нязначную актыўнасць, хоць надвор'е было спрыяючае. Асобныя германскія самалёты паяўляліся над Ліверпулем і ў некаторых пунктах Паўднёвага Уэльса.

Агенцтва Асошыэйтэд Прэс перадае, што ўчора ўночы ўпершыню за апошнія два дні непрыяцельскія самалёты скінулі бомбы на Лондан.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

АФІНЫ, 12 снежня. (ТАСС). Грэчаскае камандаванне паведамляе, што не гледзячы на моцнае супраціўленне праціўніка, прасоўванне грэчаскіх войск працягваецца ў разнастайных напрамках. Захоплены палонныя і ваеннае снаражэнне.

ЛОНДАН, 12 снежня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што цяжкія бai працягваюцца ў сектары Паградзец—Москополе.

Жорсткая барацьба адбываецца на поўначы гары Мокра каля Паградзеца, дзе супраціўленне італьянцаў узмацнілася ў сувязі з прыбыццём падмацаванняў.

Моцныя бai адбываюцца ў сектары ракі Дэвол. У даліне ракі Шкумба, вядучай к Эльбасану, а таксама на беразе Охрыда грэкі прасунуліся ўперад.

НЬЮ-ЙОРК, 12 снежня. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс, італьянцы прадпрынялі контратакі на трох франтах і захапілі некаторыя тэрыторыі на паўночны захад ад Москополе. Працягваюцца бai к поўначы ад Паградзеца. Італьянскія падмацаванні, дастаўленыя на гэты фронт на самалётах, адступаюць.

Лонданская ацэнка англійскіх аперацый у Заходняй пустыні

ЛОНДАН, 12 снежня. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, у лонданскіх ваенных кругах выказваюць думку, што англійскім сілам у Заходняй пустыні ўдалося акружыць і ўзяць у палон прыблізна 14—17 тысяч італьянцаў, якія знаходзіліся ў Сідзі-Барані і блізкаляжачых раёнах. Можна лічыць, што тут было размешчана прыблізна 2 італьянскія дывізіі. У Лондане сталі вядомы прозвішчы 3-х італьянскіх генералаў, якія папалі ў палон. Гэта—камандуючы корпусам генерал Себасцьяна Галіна, камандуючы дывізіяй генерал Арманда Пескаторэ, камандуючы дывізіяй генерал Мецары.

Бамбардыроўка французскай авіяцыяй Таі

БЕРЛІН, 12 снежня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае, што французскае міністэрства калоній увечары 11 снежня апублікавала паведамленне аб адказных дзеяннях французскай авіяцыі супроць Таі. У паведамленні гаворыцца, што 9 снежня самалёты Таі два разы бамбардыравалі гарады Саванакет. Было скінута 13 бомб. Чалавечых афяр няма.


У адказ на гэта французская авіяцыя з свайго боку бамбардыравала аэрапорт Ундорн, размешчаны ў раёне Іен-Тьяпа. Французскія самалёты скінулі бомбы агульным весам у паўтары тоны. Затым адбыўся паветраны бой над Саванакетам, у час якога быў збіт адзін самалёт Таі, а другі самалёт быў пашкоджан.

ПРАЦОЎНАЯ ПАВІННАСЦЬ МОЛАДЗІ Ў ФРАНЦЫІ

НЬЮ-ЙОРК, 12 снежня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, згодна ўмоў франка-германскага перамір'я, воінская павіннасць у Францыі адменена. Французскія юнакі, дасягнуўшыя 21 года, накіроўваюцца ў лагеры для моладзі на тэрмін ад 6 да 12 месяцаў, дзе яны займаюцца аднаўленнем і будаўніцтвам дарог, каналаў, плацін і т. д. У цяперашні час у такіх лагерах знаходзіцца каля 100 тысяч юнакоў прызыва 1940 года.

Дэкрэт генерала Антанеску

БУХАРЭСТ. 12 снежня. (ТАСС). У друку апублікаван дэкрэт Антанеску аб мілітарызацыі, у выпадку неабходнасці, любога прыватнага ці дзяржаўнага прадпрыемства і ўстановы. Мілітарызацыя азначае ўвядзенне поўнага ваеннага кантролю над прадпрыемствам, прычым усе рабочыя і служачыя прадпрыемства будуць лічыцца мабілізаванымі. Рабочыя і служачыя мілітарызаванага прадпрыемства абавязаны насіць павязку на левым рукаве з ініцыяламі і эмблемай свайго прадпрыемства. Усе мілітарызаваныя прадпрыемствы будуць знаходзіцца на час мілітарызацыі пад кантролем генеральнага штаба румынскай арміі. Рабочыя і служачыя мілітарызаваных прадпрыемстваў падлягаюць юрысдыкцыі ваеннага суда.



Новаабсталяваны рэнтгенаўскі кабінет у 3-й бальніцы гор. Беластока.

На здымку: (справа) М. А. Хват — загадчык рэнтгенаўскага кабінета за работай. На пярэднім плане рэнтгенатэхнік медсястра А. С. Ігошына.

Фота А. Сапіра.

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ

(Год работы Беластоцкага яўрэйскага драматычнага тэатра)

8-га снежня споўніўся год, як у Беластоку заснаван абласны яўрэйскі драматычны тэатр.

Тэатр за год даў 5 пастановак. На плану было намечана 7. Гэта тлумачыцца тым, што нармальная работа ў тэатры фактычна пачалася ў сакавіку.

У чэрвені калектыў тэатра выехаў на гастролі ў Пінск, Баранавічы, Слонім, Гродна і Брэст.

Калектыў тэатра паставіў 5 п'ес, з іх дзве п'есы на савецкую тэматыку: «Сям'я Овадзіс»— Перэца Маркіша і «4 дні (Юліс)» — Данядаўпа памёршага драматурга Даніэля; дзве п'есы яўрэйскай класікі: «Крывавы жарт» і «Стэмпеню» — Шолам Алейхема і п'еса Шэкспіра «Бура».

Яўрэйскі тэатр у мінулым не меў з гледачом той агульнай мовы, якая складае аснову правільнага развіцця кожнага тэатра і вызначае яго творчы воблік. Працоўныя яўрэйскія масы любілі сваіх актораў, але тэатр, пазбаўлены падтрымання дзяржавы, не мог нармальна існаваць на тыя выручкі, якія ішлі ад танных білетаў. А буржуазія ў яўрэйскі тэатр хадзіла за спецыфічнай экзотыкай, шукала лёгкай забавы. Сур'ёзным пастаноўкам яна не аказвала давер'я. І творчасць, часта «успыхваючы», патухала, цягнучы ад аднаго яркага эпізода да другога існаванне бяздомнага вандроўніка. «Сенсацыя»— такая была крыніца існавання.

Ва ўмовах савецкай улады становішча змянілася карэнным чынам. Моцная гаспадарчая база з аднаго боку, яснае ўсведамленне сваіх творчых ідэй і грамадскіх задач — з другога павінны стварыць аснову сталага, растучага кантакта паміж тэатрам і гледачом.

Арганізацыя гледача павінна, па нашай думцы, выйсці далёка за межы простай рэкламы і распаўсюджвання білетаў. Высокая якасць спектакляў — першы сродак зрабіць тэатр папулярным. Але гэта не ўсё. Неабходна паклапаціцца аб пастаянным кантакце з масамі, аб папулярызацыі тэатра як культурнай неабходнасці. Трэба папулярызаваць работу драматургаў і творчых работнікаў тэатра. Пытанне арганізацыі гледача з'яўляецца, па нашаму, асноўнай задачай дырэкцыі ў будучым. Выкананне гэтай задачы пакажа, што шматлікія масы яўрэйскіх працоўных Беластока свой тэатр не толькі «наведваюць», але і нецярпліва чакаюць кожнага новага «слова» свайго тэатра, кожнае новае творчае пачынанне сустракаюць з гарачым інтарэсам і свядомай ацэнкай.

Уступаючы ў другі творчы год пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, мы гарым жаданнем тварыць сапраўднае мастацтва на карысць нашай сацыялістычнай радзімы. Сагрэтыя разуменнем, спачуваннем і ўвагай шырокіх працоўных мас, мы ўпэўнены, што справімся са сваёй задачай.

А. Марэўскі,
рэжысёр і артыст яўрэйскага тэатра.

ХОР І ЯГО КІРАЎНІК

Хор закончыў «Песню аб Сталіне» з сімфанічнай паэмы А. Хачатурана. Доўгімі працяглымі апладысментамі выказалі прысутныя на канцэрце сваю ўдзячнасць удзельнікам хора і яго кіраўніку за выдатнае выкананне песні аб вялікім правадыру народаў краіны соцыялізма.

«Заключны хор» з оперы Туранкова «Кветка шчасця», «Хвала прыродзе» Гендэля, рускія народныя песні, яўрэйскія, беларускія—вось рэпертуар выдатнага хора беластоцкага Дома народнай творчасці, мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца Майсей Самуйлавіч Шнеер.

Сын краўца, ураджэнец Херсона, Шнеер ў 1908 годзе скончыў кансерваторыю. У 1913 годзе ён стварыў у Варшаве першы яўрэйскі хор, які існаваў да польска-германскай вайны. У састаў хора ўваходзіла ад 150 да 200 чалавек.

Хор Шнеера карыстаўся вялікім поспехам. У яго рэпертуар уваходзілі такія творы, як 9-я сімфонія Бетховена, «Рэквіэм» Моцарта, «Ноч Вальпургіі» Мендэльсона.

Шнеера лічылі ў Варшаве фанатыкам, некаторыя—проста вар'ятам. Справа ў тым, што створаны ім хор існаваў амаль выключна на асабістыя сродкі свайго кіраўніка. Усё тое, што Майсей Самуйлавіч зарабляў лекцыямі музыкі, ішло на ўтрыманне хора, на пакупку нот, кватэрную плату за памяшканне і т. д. Дастаткова сказаць, што на працягу многіх год Шнееру не аставалася грошай нават на тое, каб наняць сабе якую-небудзь кватэру. Спаў ён тады на лаўцы ў памяшканні хора.

У асноўным удзельнікі варшаўскага хора павінны былі плаціць па 50 грошаў членскіх узносаў, але так як большасць з іх былі беспрацоўнымі, то нават гэтую малую суму амаль ніхто з іх не быў у стане заплаціць. Аб якой-небудзь дапамозе з боку дзяржавы і марыць не прыходзілася. Наадварот, улады былой польскай дзяржавы думалі толькі аб тым, як перашкодзіць рабоце яўрэйскага хора. Не адзін раз яны разганялі хор, матывіруючы тым, што, моў, ён суседзям перашкаджае. У памяшканні хора часта рабіліся вобыскі.

За 26 год існавання хора не ўдалося дабіцца ўласнага піяніна. Прыходзілася пазычаць. Былі выпадкі, калі Майсей Самуйлавіч сам пераносіў для рэпетыцый фізгармонію з суседняй школы.

Людзі, якія прыязджалі ў Польшчу з Савецкага Саюза, многа расказвалі аб тым, што ў вялікай краіне соцыялізма створаны ўсе ўмовы для пладатворнага развіцця мастацтва. І Шнеер заўсёды марыў аб тым, каб трапіць у гэтую краіну. І вось пасля 17 верасня 1939 года яго мары здзейсніліся.

Створаны год таму назад хор беластоцкага Дома народнай творчасці налічвае зараз 80 чалавек рабочых і служачых. Хор дабіўся ў сваёй рабоце вялікіх поспехаў. На абласной алімпіядзе мастацкай самадзейнасці, якая адбылася ў сакавіку 1940 года, хор пад кіраўніцтвам Шнеера заняў першае месца.

Зараз хор рыхтуе да выканання рад новых твораў. Сярод іх «Гімн Кастрычніку» (музыка Шнеера), «Кракавяк» Манюшкі і рад іншых.

В. Бемаў.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ — 126. Тыраж 12 000 экз. Друкарня Беластокдруку.